ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Інфармацыйнае паведамленне*



СТУДЗЕНЬ

Віцебск 2014

**КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

**Студзень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна

Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

*КІНАМАСТАЦТВА*

**17 студзеня** ў г. Талочыне адкрыўся абноўлены кінатэатр "Колас", пабудаваны яшчэ ў 1967 годзе. 3D-кінатэатр ў горадзе – гэта першы такога роду кінатэатр з невялікіх райцэнтраў нашай вобласці.

*http://www.natal.by/?p=12218*

*МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК*

**4 снежня** ў Райцаўскім сельскім Доме культуры адбыўся ўрачысты вечар з нагоды 50-гадовага юбілею Талачынскай дзіцячай школы мастацтваў.

*http://www.natal.by/?cat=62*



ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел бібліятэказнаўства

# КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Студзень**

*Інфармацыйнае паведамленне*

ВІЦЕБСК
2014

ДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *В. М. Нявейкава*
Адказны за выпуск *А. І. Сёмкін*

**Культурнае** жыццё Віцебскай вобласці : студзень: інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2014. – 21 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2014

*МУЗЫКА*

*Аляксандра Казлова* з г. Оршы стала фіналісткай праекта АНТ “Я пою-4”.

*Витебские вести. – 2013. – 21 янв. – С. 5.*

Абласная філармонія **5 студзеня** запрасіла маленькіх гледачоў на навагодняе шоу “Новые приключения Рапунцель и ее друзей”, а **7 студзеня** дзецям была прапанавана музычная казка “Новогодние превращения”.

*http://philharmonic.vitebsk.by/*

З **28 студзеня** па **2 лютага** ў Віцебскай абласной філармоніі працавала **IV “Калядная музычная акадэмія”**. Мерапрыемства адкрылася выстаўкай навучэнцаў Дзіцячай мастацкай школы г. Віцебска “Симфония цвета”. **28 студзеня** прагучаў канцэрт фартэпіяннай музыкі, у якім выступілі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Праектам прадугледжаны майстар-класы (**28** і **29 студзеня**) і фартэпіянны канцэрт выкладчыка Маскоўскай кансерваторыі імя П.І. Чайкоўскага лаўрэата міжнародных конкурсаў Я. Старадубцава, метадычны семінар для педагогаў дзіцячых музычных школ г. Віцебска і вобласці (**29 студзеня**). **31 студзеня** адбыўся гала-канцэрт удзельнікаў і студэнта Маскоўскай кансерваторыі, лаўрэата рэспубліканскага конкурсу, пераможца Дэльфійскіх гульняў А. Іванова. У праграме фартэпіяннага вечара творы кампазітараў XVIII–XX стагоддзяў. **2 лютага** – сустрэча з маладзёжным трыо Санкт-Пецярбургскай філармоніі імя Д.Д. Шастаковіча. У канцэрце прыме ўдзел заслужаны артыст Расіі Д. Меерові ч (альт).

*http://www.vitbichi.by/?p=27711*

*ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

Народны маладзёжны тэатр “Колесо” **25 студзеня** запрасіў у КЗ “Віцебск” на прэм’еру форум-спектакля “Каток”.

**26** і **27 студзеня** на Коласаўскай сцэне акцёры тэатра “Московская оперетта” прадставілі спектакль “Сказки Венского леса”.

*kolastheatre.by/ru/news/skazki-venskogo-lesa-o-lyubvi-i-ne-tolko*

прадстаўлена інсталяцыя, праект мінскага мастака *С. Шыла*, прысвечаная 25-годдзю вывада савецкіх войск з Афганістана.

*Витебские вести. – 2013. – 18 янв. – С. 13.*

У музеі-сядзібе І. Рэпіна ”Здраўнёва” адкрылася выстаўка работ (дзесяць партрэтаў жанчын мінулага стагоддзя) мастачкі *М. Эльяшэвіч* “Зеркало времени”.

*Витебские вести. – 2013. – 18 янв. – С. 13.*

**30 студзеня** ў выставачнай зале “Духаўскі круглік” адбылася сустрэча пад назвай “Серебряный век фотографии: ретроспектива” з фатографамі творчай майстэрні “АрГентум” *К. Грынеўскай* і *У. Андрэевым.*

*ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

Да ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працавала абласная выстаўка лялек і цацак “Кірмаш цудаў”. У дзвюх залах былі прадстаўлены лялькі, выкананыя з розных матэрыялаў (саломка, лаза, гліна, дрэва, цеста, лоскут, лён, скура і інш.). Іх аўтары – члены клубаў народных майстроў Дамоў рамёстваў вобласці, індывідуальныя майстры.

*Віцебскі АМЦНТ*

У **студзені** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці прайшла прэзентацыя двух выданняў: “Мастацтва Insita: з гісторыі правядзеннявыставак непрафесійнага мастацтва” і “Мастацтва прымітыву і яго формы ў сучаснай культуры”. Укладальнік кніг – мастацтвазнаўца, спецыяліст па этнаграфіі і фальклору *Л. Вакар*.

*Витебские вести. – 2013. – 16 янв. – С. 22.*

З **16 студзеня** ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адкрыта для прагляду выстаўка народнай студыі разьбы па дрэве “Адроў” Аршанскага гарадскога Дома рамёстваў (кіраўнік Ігар Пахомчык) (сюжэтныя пано, вазы, маскі, скульптуры і інш.).

*Віцебскі АМЦНТ*



**ЗМЕСТ**

**ПРАДМОВА**……………………………………………………………………4

**ХРОНІКА ПАДЗЕЙ**

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……………………………………………………………………..5

## ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 31 студзеня 2014 года. «Хроніка падзей» таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, аддзелам культуры Міёрскага райвыканкама, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Пастаўскай, Полацкай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.



"Выстава: шчыра, на ўспамін" (*карціны са стужак і вышытыя ніткамі, ручны роспіс тканіны з выкарыстаннем воску, разьба па дрэве, габелены*).

*http://www.natal.by/?p=12252*

У Шаркаўшчынскім цэнтры рамёстваў адкрылася выстаўка адзення і вайсковага рыштунку рыцараў сярэднявечча.

*http://www.klich.by/?p=14053#more-14053*

У Полацкім Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку адкрылася выстаўка, прысвечаная памяці мастака *Сяргея Цімохава*. Вядомы жывапісец, графік, дызайнер быў дырэктарам першай у Полацку прыватнай галерэі "Рыса", пазней займаў пасаду намесніка старшыні Беларускага саюза мастакоў.

*Витебские вести. – 2013. – 30 янв. – С. 24.*

У выставачнай зале Браслаўскага музея традыцыйнай культуры прайшла прэзентацыя выстаўкі выцінанкі "Папяровы мост сяброўства". Над ёй працавалі два аўтары з Беларусі і Літвы, якіх аб'яднала адзінае творчае захапленне, – *А. Шаліма* і *Л. Федасеева*.

У Віцебску на Старасямёнаўскіх могілках адбылося адкрыццё надмагільнага помніка настаўніку многіх беларускіх мастакоў Фёдару Фогту. Гэта падарунак абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў і камбіната "Мастацтва" да 125-годдзя педагога. Выканаў работу віцебскі скульптар *А. Гвоздзікаў*.

*Витебские вести. – 2013. – 25 янв. – С. 16.*

### МАСТАЦТВА

*ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

У Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстаўка работ чэшскага фотамастака *Марціна Странкі*. У экспазіцыі прадстаўлены 15 работ з апошняга цыкла "Mono".

*Витебские вести. – 2013. – 16 янв. – С. 21.*

У выставачнай зале віцебскага Цэнтра сучаснага мастацтва была

***Чашніцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

Фестываль па творчасці П. Бажова “Сокровища малахитовой шкатулки” (*дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы*).

***Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк***

**8 студзеня** Тэатралізаваны калядны каляндар “Чудесный праздник Рождества” (*цэнтральная раённая бібліятэка*)

**26 студзеня** эка-бар “Чай пить – долго жить” для кветкаводаў клуба “Вяснянка” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**28 студзеня** Прэзентацыя выстаўкі карцін мастакоў-удзельнікаў пленэру, прысвечанага Яну Нікадэму Лапацінскаму “Нам засталася спадчына” (*Пялікаўская сельская бібліятэка*).

***Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**17 студзеня** Гульнёвая праграма для чытачоў малодшага школьнага ўзросту “Рождественские потешки” (*дзіцячая бібліятэка*).

**19 студзеня** Літаратурнае падарожжа па творчасці А. Гайдара “Добры дзень, вясёлыя людзі” (*Светласельская сельская бібліятэка*).

**19 студзеня** Літаратурная гульня “Тропою Гайдара”, прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння пісьменніка (*Слабадская сельская бібліятэка*).

**26 студзеня** Пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні “Крыніца” на тэму “Беларускія народныя святы і абрады” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

*МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ*

У віцебскай ратушы ў студзені адкрылася выстаўка, якая прадстаўляла італьянскую моду за апошнія 100 гадоў. У экспазіцыі – сумкі, абутак, аксесуары практычна ўсіх вядомых дамоў моды.

*Витебские вести. – 2013. – 25 янв. – С. 16.*

У Талачынскім гісторыка-краязнаўчым музеі працавала чарговая выстаўка твораў членаў мінскага клуба “Прырода і фантазія” пад назвай





## КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

### КУЛЬТУРА

*АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ*

Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце наваполацкай СШ № 3, кіраўнік ўзорнага хору “Звонкие голоса” *Альберт Кажушкевіч* удастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за высокія дасягненні ў эстэтычным выхаванні творчай моладзі. За высокія творчыя дасягненні ў галіне выяўленчага мастацтва, актыўную выставачную дзейнасць прэміяй адзначаны і аўтарскі калектыў у складзе членаў Беларускага саюза мастакоў *Таццяны* і *Юрыя Рудэнкаў*. Цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў прайшла 9 студзеня ў Мінску, у Палацы Рэспублікі.

*Витебские вести. – 2013. – 16 дек. – С. 22.*

Заахвочвальнай прэміі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ўдастоена *народная студыя сучаснага танца Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам Ірыны Бухавецкай* і *салістка ўзорнай студыі эстраднай песні “Форум” Цэнтра культуры “Віцебск” Віўен Сабі.*

*http://www.vitbichi.by/?p=27231*

За дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай мастацкай творчасці, адпаведны мастацкі ўзровень і творчыя паказчыкі, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, актыўную канцэртную дзейнасць пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь *вакальна-харэаграфічнаму калектыву “Азярніцы”* ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Міёрскага раёна прысвоена званне “народны”.

*http://www.mijory.by/kultura/5514-zasluzhennoe-zvanie.html*

*КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

У Віцебскай вобласці з’явіўся яшчэ адзін пабрацім. Пагадненне аб устанаўленні пабрацімскіх сувязей з правінцыяй Хэйлунцзян, а таксама праграма развіцця двухбаковых узаемаадносін падпісаны падчас візіту ў Кітай прэм’ер-міністра Беларусі М. Мясніковіча. З беларускага боку дакумент падпісаў намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама А. Мацкевіч, які ўваходзіў у склад урадавай дэлегацыі. Плануецца, што прадстаўнікі правінцыі наведаюць у гэтым годзе Міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”.

*Витебские вести. – 2013. – 28 дек. – С. 3.*

Паміж Віцебскім абласным краязнаўчым музеем і Музеем Зарасайскага краю (Літва) падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве па праекце “Дорога еврейской культуры: Юрий Пэн и его знаменитые ученики”.

*http://www.vitbichi.by/?p=26769*

Вучань чацвёртага класа г. Оршы *М. Мядзведзеў* заняў I месца ў Міжнародным конкурсе мультымедыйных рэсурсаў “Спорт в изобразительном искусстве”, які быў аб’яўлены Дзяржаўным Рускім музеем напярэдадні Алімпійскіх гульняў у Сочы.

*Витебские вести. – 2013. – 18 янв. – С. 3.*

## КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

*КЛУБНАЯ СПРАВА*

Цэнтр культуры “Віцебск” завяршыў святочную кампанію “З Новым годам, любімы горад!”. Самымі папулярнымі традыцыйна сталі навагоднія прадстаўленні для дзяцей і бацькоў. Інтэрактыўны мюзікл “Пітэр Пэн” на сцэне канцэртнай залы “Віцебск” з **18 снежня** па **6 студзеня** паглядзелі больш за 15 500 гледачоў. У Цэнтры культуры “Віцебск” для дзяцей ад 2 да 9 гадоў Народны тэатр гульні падрыхтаваў



**3 студзеня** Гадзіна знакамітай асобы “Талент, дадзены богам”, прысвечаная 90-гадоваму юбілею пісьменніка А. Савіцкага (*бібліятэка-філіял № 8*).

**9 студзеня** Гульнёвая праграма для дзяцей “Свята жаданняў і надзей” (*Завозерская сельская бібліятэка*).

**9 студзеня** Культурна-гістарычны экскурс для студэнтаў Полацкага педагагічнага каледжа “Сияй, нетлеющее пламя рождественской свечи!”(*бібліятэка імя Я. Купалы*).

**10 студзеня** Мерапрыемства для дашкольнікаў “Праздник любви, тепла и добра” (тэатралізаванае прадстаўленне “Что подарить Иисусу Христу?”, гутарка “Праздник Рождества” і інш.) (*Саланіцкая сельская бібліятэка*).

**22 студзеня** Літаратурная гульня да 110-годдзя з дня нараджэння пісьменніка А. Гайдара “Кто они, герои Гайдара?” (*Шпакоўчшынская сельская бібліятэка-клуб*).

### *Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк*

**10 студзеня** Тэатралізаванае прадстаўленне “Светлый праздник Рождества” (*Іллюшынская сельская бібліятэка сумесна з Іллюшынскай сярэдняй школай*).

Віртуальная вандроўка для навучэнцаў пачатковых класаў ДУА “Ушацкая сярэдняя школа” “Путешествие в город Спасибоград”, прымеркаванае да Міжнароднага дня “дзякуй” (*дзіцячая бібліятэка*).

Сустрэча навучэнцаў старэйшых класаў ДУА “Ушацкая сярэдняя школа средняя школа” з псіхолагам на тэму “Верьте в себя”. Мерапрыемства адбылося ў рамках пасяджэння маладзёжнага клуба “Правовой навигатор” (*цэнтральнаая раённая бібліятэка імя Е. Лось*).

Урок мужнасці да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакоста “Украденное детство” для навучэнцаў ДУА “Вялікадолецкі дзіцячы сад–сярэдняя школа імя П. Броўкі ”(*Вялікадолецкая сельская бібліятэка*).

**24 студзеня** Конкурс “Книга рекордов детской библиотеки” (*дзіцячая бібліятэка*).

***Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк***

У **студзені** ў бібліятэках Дубровенскага раёна прайшлі наступныя мерапрыемствы:
літаратурна-пазнавальная гульня “Новый год – время волшебства” (*сельская бібліятэка аграгарадка Ляды*), тэматычны вечар “Волшебство Рождественской звезды” (*сельская бібліятэка аграгарадка Сваташыцы),* фальклорная гадзіна “Прыйшла Каляда…” (*сельская бібліятэка аграгарадка Зарубы*), лялечнае прадстаўленнне па папулярызацыі здаровага ладу жыцця “Здоровье в саду и на грядке” (*дзіцячая бібліятэка*) і інш.

***Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк***

**17 студзеня** Прэзентацыя кніжнай выстаўкі “Гэта ўсё Беларусь”, прывечанай Году гасціннасці (*дзіцячая бібліятэка*).

**25 студзеня** Літаратурна-музычны вечар “Таня, Танечка, Танюша...” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**4 студзеня** Духоўная гутарка “Спаситель мира”, прысвечаная Нараджэнню Хрыстову (*дзіцячая бібліятэка*).

**21 студзеня** Урок права “Ваши права в ваших руках” з навучэнцамі Пастаўскага прафесійнага каледжа.

***Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк***

З **2** па **9 студзеня** Акцыя “С Новым годом чтения!” (любое выданне з платнага абанемента – бясплатна, каляровыя закладкі з віншаваннямі, латарэя і кнігі-падарункі і інш.) (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).



спектакль-гульню “Навагодні перапалох”. Прадстаўленне ўбачылі амаль 5000 дзяцей і бацькоў. Не засталася ў баку ад святочнага марафону і выставачная зала “Духаўскі круглік”: экспазіцыі, прысвечаныя Віцебскім замкам і Міжнароднаму фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”, наведалі каля 200 чалавек. Сярод іх – турысты з г. Масквы, г. Санкт-Пецярбурга, г. Смаленска, Карэліі, Гатчыны, г. Ніжняга Ноўгарада. Прыязджалі школьныя і турыстычныя групы з г. Мінска, Віцебскага рэгіёну , але самымі “далёкімі” гасцямі сталі турысты са ЗША. У Комплексе культурна-масавага адпачынку імя Савецкай Арміі праводзіліся дні сямейнага адпачынку, масавыя гулянні з конкурсамі, гульнямі, танцамі і канцэртнымі праграмамі (**25 снежня** – “Зіма кліча на старт!”, **1 студзеня** – “Дабра і шчасця ў Новы год!”, **7 студзеня** – “Калядныя забавы”). Традыцыйна працаваў пракат спартыўнага інвентару. Мюзікл “Пітэр Пэн” і спектакль “Навагодні перапалох”наведалі выхаванцы Дзіцячага дома г. Віцебска, Віцебскай спецыяльнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннем слыху, дзеці, якія стаяць на ўліку ў грамадскіх аб'яднаннях “Беларускае таварыства інвалідаў па зроку” і “Дзеці ў бядзе”. Таксама для хлопчыкаў і дзяўчынак былі праведзены экскурсіі ў Духаўскі круглік і арганізавана прагулка па парку Мазурына. Акрамя таго, на бязвыплатнай аснове на плошчы Перамогі і плошчы Свабоды былі размешчаны відэаматэрыялы, накіраваныя на прыцягненне ўвагі грамадскасці да лёсу дзяцей-сірот.

*http://www.gck.by/category/news/*

**4 студзеня** ў Міёрскім РДК віталі гасцей на традыцыйным конкурсе каталіцкай песні “Зорка Бэтлеему”. Выступалі артысты парафій г. Наваполацка, г. Браслава, г. Паставы, в. Ахрэмаўцы (Браслаўскі раён) і г. Міёры. У перапынках паміж выступленнямі парафій праводзілі розныя гульні і забавы з гледачамі. Міні-канцэрт прадставіў каталіцкі гурт з г. Мінска “Laudans”.

**7 студзеня** клубныя ўстановы раёна праводзілі святочныя

мерапрыемствы, прысвечаныя Нараджэнню Хрыстову. Гэта мерапрыемствы розных форм: народныя абрады “калядаванне” (Язненскі СДК, Чапукоўскі СДК, Дварнасельскі СК, Лявонпальскі СЦКД, Папшулеўскі СК); агеньчыкі (Дзісненскі ГЦК, Чэраскі СДК); тэатралізаваныя святы (Дзісненскі ГЦК, Істаўскі СК, Папшулеўскі СК, Перабродскі СДК, Павяцкі СДК); канцэрты (Язненскі СДК “Цудоўнае свята”, Новапагосцкі СК “Калядныя забавы”, Мікалаеўскі СК “Славім Нараджэнне Хрыстова!”, “Калядныя сустрэчы” ў Сіцькоўскім СК) і інш. У абноўленай зале Міерскага РДК на суд гледачоў была прадстаўлена музычная камедыя “Старая, старая казка…”. Музычны спектакль падрыхтавалі тэатр мініяцюр “Свае хлопцы” і Міёрскія артысты пад рэжысёрскім кіраўніцтвам Вольгі Борскай.

**11 студзеня** ў раене  святкавалі Сусветны дзень “дзякуй”. У клубных установах раёна праводзіліся тэматычныя праграмы дыскатэк, вечары адпачынку, забаўляльныя праграмы для дарослых і дзяцей, вусныя часопісы. На “стары” Новы год, 14 студзеня, традыцыйна ў раёне адбыўся шэраг святочных мерапрыемстваў: у Папшулеўскім СК канцэрт “Зімнія напевы”, канцэртная праграма ў Чапукоўскім СДК “Стары Новы год”, канцэрт у Дзісненскім гарадскім цэнтры культуры, агеньчык “Ах, гэты “стары” Новы год!” у Чэраскім СДК, клубныя вячоркі адбыліся ў Павяцкім СДК і Волкаўшчынскай бібліятэцы-клубе, тэатралізаванае свята адбылося ў Язненскім, Цвецінскім і Перабродскім СДК, тэатралізаванае прадстаўленне “Навагодні карнавал” прайшло ў Туркоўскім сельскім Доме культуры.

*Аддзел культуры Міёрскага райвыканкама*

**9 студзеня** ў Верхнядзвінскім раённым Доме культуры прайшоў “Рождественский фестиваль” з удзелам прадстаўнікоў усіх канфесій раёна. У канцэрце ўзялі ўдзел выхаванцы нядзельных школ, творчыя калектывы раёна, вучні дзіцячай школы мастацтваў. Працавала выстаўка духоўнай літаратуры, царкоўных рэчаў, народных рамёстваў, вырабаў дзіцячай творчасці.

*http://www.d-p.by/2014/01/v-verxnedvinske-proshyol-rozhdestvenskij-festival-3/*



***Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк***

**9 студзеня** Выстаўка-агляд “Рождество – время чудес” для раённага каляднага фестывалю “Падарунак з нябёсаў” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**15 студзеня** Мультымедыйная прэзентацыя кніг-юбіляраў 2014 года “Кнігі, праверяныя часам” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**21 студзеня** Віртуальны экаваяж “Запаветны напеў зямлі беларускай” (*дзіцячая бібліятэка*).

***Віцебская раённая сетка публічных бібліятэка***

**12 студзеня** Фальклорна-абрадавы вечар “Гуляй, грамада, бывай, Каляда!” (*Ноўкінская сельская бібліятэка сумесна з ўдзельнікамі клуба інтэрнацыянальнага сяброўства “Возьмемся за рукі, сябры”).*

**14 студзеня** Паэтычная вечарына “Нас яднае да кнігі любоў” з удзелам А. Лазебнай, Н. Салаўёвай, Л. Несан, У. Джарыяні, барда С. Каробкіна (*Кіраўская сельская бібліятэка*).

**23 студзеня**. Сустрэча са старшыней Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Т.І. Красновай-Гусачэнка (*Акцябрская сельская бібліятэка*).

***Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**2 студзеня** Турнір знаўцаў “Новый год настаёт” для вучняў малодшых класаў (*Пальмінская сельская бібліятэка*).

**3 студзеня** Ранішнік “Рады мы проказам матушки-зимы” (*дзіцячая бібліятэка*).

**6 студзеня** Калядныя вячоркі “Пришла Коляда – открывай ворота” (*Прудніцкая сельская бібліятэка*).

***Докшыцкая раённая сетка публічных бібліятэк***

**2-3 студзеня** Акцыя “Кніжны карнавал” (віншаванне чытачоў, літаратурныя конкурсы і інш.) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

***Наваполацкая гарадская сетка публічных бібліятэк***

**14 студзеня** Адкрыццё персанальнай выстаўкі “Аўтарскі каларыт” мастака-аматара Таццяны Зносак (г. Полацк) (жывапіс, фатаграфіі на палатне, вітраж, дэкаратыўныя вырабы) (*цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

**14 студзеня** Вечар-віншаванне “Добрым словом друг друга согреем” членаў гарадской арганізацыі грамадскага аб’яднання “Белорусское общество инвалидов”, якія ў зімнія месяцы спраўляюць дні нараджэнні і юбілеі (*цэнтральная бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

Іміджавая акцыя “Вместе с книгой в Новый год” (*бібліятэка імя У. Караткевіча*).

***Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк***

**17 студзеня** Пазнавальная гадзіна “12 символов года, или Что ждет нас в год Лошади” для наведвальнікаў аддзялення кругласутачнага знаходжання грамадзян сталага ўзросту і інвалідаў у вёсцы Баруны (*Барунская сельская бібліятэка*).

**26 студзеня** Літаратурная гасцёўня па творчасці М. Цвятаевай “Поэзия как всплеск души”(*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**29 студзеня** Літаратурнае падарожжа па творчасці М. Лермантава “К той, ято прекрасна, как мечтанье” ў час пасяджэння падлеткавага клуба “Сучаснік” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

**Да 70-годдзя вызвалення Беларусі** ў рамках праграмы “Далёкому мужеству верность храня” ў *дзіцячай бібліятэцы* на працягу месяца адбыліся наступныя мерапрыемствы:

- урок мужнасці “Бессмертный подвиг крепости над Бугом”;
- кніжная выстаўка “Брэсцкая крэпасць: старонкі гісторыі”;
- каляндар ваенных аперацый “Хроніка вызвалення Беларусі”.

**5 студзеня** Эколага-пазнавальная гадзіна па кнігах Галіны і Сргея Трафімавых “Ёлочкины секреты” (*Богінская сельская бібліятэка*).



**17** і **24 студзеня** ў гарадах Докшыцы і Дуброўна адбыліся занальныя адборачныя туры абласнога этапу II Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў “Зорка ўзышла над Беларуссю”, у якіх прынялі ўдзел 70 мастацкіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў.

*Віцебскі АМЦНТ*

З **20** па **24 студзеня** ў Віцебскім абласным цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі абласныя курсы для дырэктараў сельскіх дамоў культуры, загадчыкаў сельскіх клубаў на тэму “Сучасныя падыходы да арганізацыі дасуга на сяле”.

*Віцебскі АМЦНТ*

Напярэдадні 70-годдзя вызвалення в. Заронава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбыўся круглы стол з ветэранамі і людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Калектыў Заронаўскага Дома культуры арганізаваў канцэрт “Мы жадаем шчасця вам...”. У музеі “Гісторыя Заронаўскай краю” ўвазе гасцей была прадстаўлена экспазіцыя, якая ўсебакова адлюстроўвае мінулае гэтай мясцовасці.

*http://www.pridvinje.by/*

У **студзені** дзесяцігоддзе творчай дзейнасці адзначыў тэатр малых форм Лёзненскага Дома культуры “ТЭМП” (мастацкі кіраўнік Ж. Лукіна).

*http://www.lioznonews.by/category/culture/*

*ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ*

У гэтым годзе свята духоўнай музыкі сабрала калектывы з Магілёва, Мінска, Масквы, Сергіева Пасада, Вялікага Ноўгарада і Віцебска.**7 студзеня** ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа прайшлі першыя канцэрты пад агульнай назвай “Рождественское созвучие”. Спевы гучалі ў Віцебскай духоўнай семінарыі і ў Свята-Успенскім кафедральным саборы. У храме выступілі вакальная група ансамбля інстытута пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, канцэртны хор “Веснянка” (г. Масква), Акадэмічны хор Магілёўскага

філіяла Беларусай акадэміі музыкі. Завяршылася свята **8 студзеня** канцэртам ў абласной філармоніі.

*Витебские вести. – 2013. – 9 янв. – С. 23.*

**18** і **19 студзеня** ў Віцебску ў 29 раз праходзіў традыцыйны **Міжнародны конкурс сусветнай класіфікацыі WDSF па спартыўных бальных танцах "Віцебская сняжынка"**. Турнир прынёс поспех вицебским танцорам. Першыя месцы ў намінацыі "Начинающие взрослые латина" занялі *І. Ліпко* і *В. Лушчыкава* ("Арабеск"). А ў намінацыі "Дети 1 «Н-4» начинающие" не было роўных *П. Марозавай* і *В. Тхарову* ("Динамо"), *А. Аўласевічу* і *Д. Дзядкоўскай* ("Аэліта"), *М. Котаву* і *А. Карчэўскай* ("Аэлита"), *Г. Астапенку* і *А. Захаравай* ("Динамо").

*http://www.vitbichi.by/?p=27515*

*БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

***Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна***

**4 студзеня** ў абласной бібліятэцы адбылося адкрыццё юбілейнай выстаўкі мастака, кандыдата педагагічных навук, дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва УА "ВДУ імя П.М. Машэрава" *Р.С. Фядзькова* "Пленэр".

**6 студзеня** ў рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі "Нашы дзеці" супрацоўнікі абласной бібліятэкі правялі навагодні ранішнік ў афтальмалагічным аддзяленні для дзяцей УАЗ "Віцебская абласная клінічная бальніца" .

**14 студзеня** ў аддзеле перыядычнай літаратуры абласной бібліятэкі адбылася прэзентацыя манаграфій прафесара, расійскага гісторыка і пісьменніка *А.А. Чароміна* "Полоцкое княжество (IX–XIV века)" и "Туровское княжество (X–XIV века)".

**16 студзеня** супрацоўнікі абласной бібліятэкі прынялі ўдзел у пасяджэнні калегіі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Да мерапрыемства была падрыхтавана выстаўка выданняў экалагічнай тэматыкі з фонду Віцебскай абласной



бібліятэкі "Экология. Природа. Жизнь". У экспазіцыі таксама былі прадстаўлены бібліяграфічныя выданні па экалогіі, створаныя супрацоўнікамі бібліятэкі.

**18 студзеня** ў ДКУ "Віцебская абласная філармонія" супрацоўнікамі агульнай чытальнай залы і аддзела тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры была прадстаўлена выстаўка літаратуры «Буду мамой».

***Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк***

**9 студзеня** Акцыя па зборы адзення, цацак і пісьмовых прынад "Передай добро по кругу" для выхаванцаў УА "Віцебскі дзяржаўны гарадскі сацыяльна-педагагічны цэнтр" (*бібліятэка імя Я. Коласа*).

**23 студзеня** Сустрэча школьных бібліятэкараў вобласці з віцебскімі пісьменнікамі *В. Строкіным, А. Герашчанкам* і паэткай *А. Крыклівец* (*бібліятэка імя У. Караткевіча*).

**23 студзеня** Сустрэча з псіхолагам А.А. Акмасавай, якая расказала пра псіхалагічнае значэнне свята для чалавека (*бібліятэка імя І. Крылова*).

**23 студзеня** Літаратурны ранішнік "Краіна мужнасці і высакародства А. Гайдара", прысвечаны 110-годдзю вядомага пісьменніка. Вучні 4 "А" класа гімназіі № 9 сумесна з бібліятэкарамі падрыхтавалі тэатралізаваны ўрывак з аповесці "Цімур і яго каманда" (*бібліятэка імя А. Гайдара*).

**27 студзеня** Гадзіна памяці да 70-годдзя зняцця блакады "Ленінград, які не ведаў паражэння", на якую была запрошана былая блакадніца (зараз старшыня пярвічнай ветэранскай арганізацыі ГА "БСБЛ Кастрычніцкага раёна г. Віцебска) *Святлана Пятроўна Базылева* (*бібліятэка імя С. Маршака*).

**29 студзеня** Трэнінг па фарміраванні гарманічнай жыццёвай прасторы і эмацыянальнай устойлівасці з псіхолагам А.А. Акмасавай для навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага каледжа будаўнікоў (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).